# АЛІТЭРАЦЫЙНЫЯ ПАЎТОРЫ З УДЗЕЛАМ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ НЕАЛАГІЗМАЎ

***Неўмяржыцкая С.І.*** *(УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *І.М. Мацвеенка, выкладчык*

Гукі ў вершы з'яўляюцца пасрэднікамі паміж аўтарам і чытачом, яны здольны выклікаць самыя розныя ўяўленні, садзейнічаюць мілагучнасці (эўфаніі) верша. Мілагучнае – гэта зручнае ў вымаўленні і прыемнае для слыху слова. Даволі часта мілагучнасць узмацняецца дзякуючы гукавым паўторам. Большая колькасць зычных у фанетычнай сістэме беларускай мовы абумоўлівае распаўсюджанасць алітэрацыйных паўтораў, якія ў залежнасці ад колькасці гукаў падзяляюцца на аднагукавыя, двухгукавыя, трохгукавыя.

Аднагукавыя алітэрацыйныя паўторы сустракаюцца даволі часта і па месцы размяшчэння часцей з'яўляюцца анафарычнымі: *Ведаюць вуліцы* ***вусціішнасць*** *крокаў тваіх, Ведае вечар узвышанасць мараў высокіх* (М. Шабовіч); ***Камяняр*** *крута камень куе* (Р. Барадулін); *І нельга вызначыць каратамі Каменне колаў* ***крутаколае*** **(**Р. Барадулін). Паўтарэнне аднаго зычнага гука можа выкарыстоўвацца ў якасці гукаперaймання для таго, каб падкрэсліць пэўныя з'явы ці стварыць гукавыя асацыяцыі, напрыклад, гучанне слоў з гукам [*д*] у вершы У. Марука перадае гучанне дудкі: ***Дуднула*** *дудка, А ў дудзе Нячутныя пачуў я крокі.*

Двухгукавыя алітэрацыйныя паўторы падзяляюцца на простыя (двухразовыя): ***Зваўчэлыя*** *сабакі ўзвылі блізка – Дух чалавечы незнаёмы ім* (Г. Булыка) – і шматразовыя: *Мы не* ***адродкаў*** *племя, мы – народ ! Узнімемся ў нябёсы гордым клінам !* (Д. Бічэль-Загнетава); *А тым болей – шык* ***бравуры****, Буры, што былі, не буры, Залежы макулатуры, Што не ўзяць навейшым бурам* (А. Лойка).

**Трохгукавыя алітэрацыйныя паўторы** сустракаюцца радзей: *Снежань* ***Снежыць****, Снежна, Зайчыку Не ўежна, Шэраму Не ўлежна* (А. Дзеружынскі); *І ад праўды адвернуцца, Каб вярнуцца да казак. І душа-****аднаверніца*** *Споўніць свой абавязак* (Р. Барадулін).

Такім чынам, эўфанія адыгрывае важную ролю ў паэтычным творы. Гукапіс дапамагае дасягненню гармоніі, спрыяе перадачы значных вобразаў, робіць іх больш яркімі і экспрэсіўнымі. Асобае значэнне мае пры гэтым паўтарэнне тых ці іншых гукаў, з дапамогай якога паэты засяроджваюць увагу чытача, ствараюць гукавыя асацыяцыі.

**Літаратура**

1. Журавлёв, А.П. Звук и смысл: кн. для внеклас. чтения уч ст. клас / А.П. Журавлёв. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Просвещение, 1991. – 160 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

2. Торра, В.А. Эўфанічныя сродкі моўнай выразнасці ў паэзіі Р. Барадуліна: аўтарэф. дыс... канд. філал. навук : 10.02.01 / В.А. Торра ; ГДУ імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2006. – 20 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина